# ГРАФІЧНЫЯ СРОДКІ АФАРМЛЕННЯ ПАЭТЫЧНЫХ ТЭКСТАЎ РЫГОРА БАРАДУЛІНА

**М. М. Усава**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны», Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік В. А. Ляшчынская, д-р філал. навук, прафесар

Экспрэсіўнасць, выразнасць паэтычнага твора як камунікатыўная якасць мае моўныя і нямоўныя спосабы рэалізацыі. Праз пісьмовую форму мовы графіка можа стаць крыніцай выразнасці, з дапамогай графічных сродкаў аўтары паэтычных твораў выдзяляюць літары, словы, сказы, якія маюць адметную сэнсава-эмацыйную нагрузку, выяўляюць ідэйна-эмацыйны змест, «высвечваюць» глыбіню падтэксту.

У пісьмовым маўленні для вылучэння асобных слоў, словазлучэнняў, сказаў, радкоў выкарыстоўваюцца падкрэсліванне, петыт, тлусты шрыфт, курсіў, друкава-

ныя літары, іншамоўная графіка і іншыя «тыпаграфічныя сродкі акцэнтавання». Аднак кожны аўтар выбірае толькі тыя традыцыі і тэндэнцыі, якія лічыць важнымі, адпаведнымі для сваей творчасці, таму ў апошні час некаторыя даследчыкі характарызуюць тэкст не як паслядоўнасць вербальных знакаў, а як прасторавае графічнае рашэнне. Арыгінальна выкарыстаныя традыцыйныя графічныя сродкі, а таксама адступленні ад графічнай нормы набываюць новы сэнс і становяцца раўнапраўнымі элементамі выказвання.

Абраўшы аб’ектам вывучэння паэтычныя творы Рыгора Барадуліна, прааналізуем іх з пункту гледжання аўтарскай кампанацыі, выяўлення тыпаў і ролі графічных сродкаў пісьмовага маўлення паэта.

Адным з пашыраных сродкаў графікі паэзіі Р. Барадуліна трэба прызнаць выдзяленне слоў, спалучэнняў слоў у асобныя радкі, лесвіцы слоў, у разрадку, з падзелам на склады, тым самым вылучаючы іх з тэксту верша, завастраючы на іх увагу чытача, як, напрыклад, у наступных фрагментах вершаў:

Не збудзілася дзенная тлумата.
Шлях мой дадому – ў небе там.
Будзіць на досвітку Алма-Ата
Высвістам,
Пошчакам,
Шчэбетам («Сакавік»)[1]

У сасняку гадоў
І цераз
Раку падзей
          надзей
          і страт
Гаворыць з векам
Зоська Верас
І слухае
Старэйшы брат. («Бяседа»)

Нярэдка аўтар выдзяляе слова ці яго частку з дапамогай разрадкі, падзелу на склады, курсіву, напісання друкаванымі літарамі і інш., напрыклад:

Каб не кранулі завязь халады,
Каб яблыку мальбы
Было дзе ўпасці,
Каб не ўрачы і ў думках
Слова ш ч а с ц е,
Шукаю вір,
Забыўшы на брады… (***)

Чытае памяць па складах:
Мі-ко-ла Хве-да-ро-віч («Здарожаны посах»);
Гады, як пласкадоначкі,
Сплылі.
Шуміць трысце ўначы;
*– Не бі, не бі ў ладоначкі,*
*Не псуй, не псуй пярсценачак!*
(«Матчыны рукі»)

– А табе гэта ўсе па плячы, /Бо ты, Ільіч, – / НЕЎМІРУЧЫ! («Неўміручы») і інш. Нярэдка паэт карыстаецца іншамоўнай графікай пры напісанні слоў, у выбары загалоўкаў вершаў, як, напрыклад, «Viva», «Via Nastea», «Omnia mea mecum porto», «Tropicana» альбо revolucion («Трывалая рыфма»), companero («У парку Леніна ў Гаване») і інш., хоць маюцца выпадкі напісання, наадварот, іншамоўнага слова кірыліцай, напрыклад: А ен прыгаворваў: – Гут! («Перад блакадай»), «Сэйл» і інш.

Вялікая літара служыць выдзяленню ўласных назваў, у паэзіі сігналізуе аб пачатку тэксту, першага слова ў вершаваных радках. І такі традыцыйны запіс уплывае на фарміраванне цэласнага рытмічна-меладычнага адзінства. Напрыклад, кожны ра-

---

[1] Ілюстрацыйны матэрыял падаецца паводле узораў графічнага афармлення крыніцы, паколькі адным са сродкаў графічнага афармлення скарыстаны і курсіў.

док усіх строф верша «Гальфстрым», як і многія іншыя вершы паэты, пачынаецца з вялікай літары:

На лета Ледавіты
Глядзіць старым маржом,
Але таленавіты
Пабочны сын
Гальфстрым

Хварэе рэнесансам –
Стыль айсбергавы прэч!
Ен спекай пранізаўся –
Старэча, не пярэч!

Заўважым на выкарыстанне вялікай літары першага слова вершаванага тэксту аўтара, выдзеленай улева за межы радка і набранай тлустым шрыфтам і павялічаным памерам, як, напрыклад, наступны верш без назвы:

Дабраўшы праўды груз, лухты луску,
Тугу дапіўшы з зорнага каўша,
Дзіцем застанься здзіўленым, душа,
Нібы адбітак ножкі на пяску.

У творах Р. Барадуліна ў асобных выпадках адзначаюцца напісанні слоў з вялікай літары, абраныя аўтарам з мэтай узмацнення іх стылістычнай выразнасці, як, напрыклад, словы *Радзіма* ў вершы «Каб толькі!» (У позірку – сіне-сінім… /Тады я гарачую смеласць меў /Назвацца ў Радзімы сынам), *Зямля* (Усеялі знаемы твар Зямлі /Радзімкі стрэх /Як ластавінне, густа. (***)

Для вершаваных твораў Р. Барадуліна характэрна частае выкарыстанне прысвячэнняў, набраных меншым памерам літар, аформленых курсівам і змешчаных злева пасля назвы твора.

Такім чынам, для графічнага афармлення паэтычных твораў беларускі пясняр Р. Барадулін шырока скарыстоўвае разнастайныя сродкі графікі. І такая яго сістэма арганізацыі графічных сродкаў толькі павялічвае ўздзеянне, акцэнтуе ўвагу чытача, дапамагае яму асэнсаваць думку, адчуць эмоцыі паэта. Схільнасць да ўжывання традыцыйных або нетрадыцыйных графічных сродкаў з’яўляецца адным з найважнейшых прынцыпаў архітэктанічнай і кампазіцыйнай арганізацыі тэксту, а таксама для вызначэння асобных прыкмет і асаблівасцей ідыястылю пэўнага мастака.